Дзярж. б-ка 20 г.-30 г.
бел. аддз.

ТЕТРАДЬ

[illegible] Ю. Б[illegible]

Дзяржаўнай бібліятэцы
імя У. І. Леніна

ад сведкі яе нараджэння як
Універсітэцкай бібліятэкі і
зацікаўленага ўдзельніка
шмат якіх падзей.

Бібіла Юлія Осіпаўна
уласнаю рукою

1921- 1971 гг.

# Дзяржаўная бібліятэка — 20-ыя — 30-ыя гады
## Беларускі аддзел.

Калі мне здараецца ехаць па Ленінскім праспекце, заўсёды цягне глянуць на будынак[x)] Дома мастацтваў, што стаіць на ўзгорку побач з Домам афіцэраў. Тут увосень 1921 года разгарнула работу Універсітэцкая (з 1922 года Універсітэцкая і Дзяржаўная) бібліятэка.

Бібліятэку ўзначаліў І. Б. Сіманоўскі, якога ўпрасілі ўлетку 1921 года заняцца арганізацыяй бібліятэкі для Універсітэта, які павінен з восені адчыніцца. Гэта быў чалавек з шырокім далягядам і далёка-сяжнымі перспектывамі.

Уладкаваўшыся ў Мінску, ён часам наведваў Бабруйск, дзе раней загадваў гарадской бібліятэкай, а я ў той час працавала ў школах і марыла пра універсітэт. Ведала я яго здаўна як улюбёнага ў сваю справу кніжніка, гатовага пазычыць

---

x) Добрае фота гл. ў альбоме „Узнята з руін"

сваімі (здавалася ў той час) неверагоднымі праектамі і задумамі. Спадкаўшыся са мною, пачаў мяне запрашаць на працу ў Менск у бібліятэку. Ён успомніў спробу арганізаваць у Бабруйскай бібліятэцы краязнаўчы аддзел; як я, захапіўшыся гэтай ідэяй, узялася дапамагаць і нават ездзіла ў Менск шукаць літаратуры, а вярнулася з пачкамі каштоўных выданняў з уласных збораў — Янкі Купалы. (Гэта было ўвосень 1920 году пасля вызвалення Менска ад белапольскай акупацыі). І. Сімановскі запэўніў, што краязнаўчы аддзел у новай бібліятэцы будзе шырока разгорнуты, а ён пастараецца зрабіць усё магчымае, каб даць простор маім краязнаўчым захапленням. Ну, як было застацца абыякай да думкі стварыць нешта вартае на парожнім месцы! Мне прапанавалі працу ў школе, у Наркамасвевеце (каб вучыцца, трэба было недзе працаваць, бо стыпендый не давалі). Бліскучыя перспектывы краязнаўчай працы ў

у бібліятэцы маім задачы, і я выратаўся прыняць яго прапанову.

З верасня 1921 года я ўжо сядзела сярод бібліятэчных паліц на рагу сучасных вуліц Кірава (тады Універсітэцкай) і Чырвонаармейскай. Тады быў будынак нейкай школы, потым тут размясціўся Рабфак, цяпер не тым месца - філфак Універсітэта. Факультэт грамадскіх навук, куды я залічылася на этнолага-лінгвістычнае аддзяленне, знаходзіўся на вуліцы Кірава (Універсітэцкай) прыблізна на рагу вуліцы Леніна ў будынку школы. Насупраць - незабудаваны пляц, старыя яўрэйскія могілкі.

Разгортваць работу Універсітэцкай бібліятэкі ў тым будынку было немагчыма - шырокія задачы патрабавалі і належных прастораў. Скора удалося здабыць так званы „Юбілейны" дом на Захар'еўскай вуліцы (цяпер праспект Леніна) на ўзгорку. Побач з ім у былым доме архірэя размясціўся Наркамасветы. „Юбі-

лейны" дом таксама належаў духавенству
і быў набудаваны ў 1913 годзе ў гонар 300
-годдзя царскай дынастыі Раманавых. Тут
адбываліся парады духавенства і змяшчаў-
ся Царкоўна-археалагічны музей.

Страшнавата было перабірацца (зіма не
за гарамі) у неабжыты, без ацяплення будынак.
Цяпер, пасля рамонту, дом мастацтваў іна-
чай выглядае — трохпавярховым, а ў той
час вокны ніжняга паверха глядзелі ў
зямлю, бо ўзгорак быў значна вышэйшы.
Тут было падвальнае памяшканне: змя-
шчаліся майстэрні столяра і пераплётчыка,
неразабраныя фонды. Вышэй на паверсе
злева вялікая зала вышынёй на два па-
верхі з галярэяй. Неўзабаве яе перакрылі,
і ўнізе размясціўся кнігасхоў, а наверсе —
чытальная зала. Цікавае было прыстасa-
ванне для зносін з кнігасховам. На галя-
рэі, дзе сядзелі дзяжурныя, у падлозе быў

праразаны чатырохкутнік; пры дапамозе збудавання з дроту і яшчэ сяго-таго, значыць паскаралася выкананне патрабаванняў чытачоў, ды і нагам не трэба было скакаць па сходах. А часам гэта адтуліна замяняла тэлефон.

Супраць уваходзе ў чытальную залу — дзверы у беларускі аддзел. Гэта быў вялікі пакой з шырокімі вокнамі, пузатымі жоўтымі шафамі. Праз увесь пакой цягнуўся доўгі дубовы стол. Пасярэдзіне печка „буржуйка". Выгінастая труба праз верхнюю шыбу акна выводзіла дым. І доўга яшчэ пасля таго, як удалося наладзіць цэнтральнае ацяпленне, на вокнавай сцяне будынка можна было бачыць чорныя сляды сажы. У канцы пакоя былі адгароджаны фанерай два маленькія пакойчыкі; направа — „кабінет" дырэктара, застаўлены шафамі, на стале і крэслах навалены ў бязладдзі кнігі, месца хапала толькі, каб павярнуцца. Праўда,

6.

дырэктар тут рэдка калі забягаў.

Праз акно залы направа можна было агледзець брукаваную Захараўскую вуліцу, стромкія драўляныя прыступкі на ўзгорак/супраць уваходу ў бібліятэку. Справа і злева на ўзгорку віліся сцежкі, па якіх таксама можна было трапіць у бібліятэку. Другія тры акны пазіралі ў садок, відаць было некалькі яблынь і разлапістых каштанаў. Далей, на рагу Чырвонаармейскай, знаходзіўся (двухпавярховы?) трохпавярховы будынак, які праз пэўны час быў заняты бібліятэкай. Тут размясціліся канцылярыя, кніжная палата, чытальная зала прыродазнаўчага профілю, а таксама кватэра дырэктара. (Будынак і цяпер захаваўся).

Калі ў апошнія гады І. Сіманоўскі збіраўся пісаць гісторыю ўтварэння бібліятэкі, мы часта ўспаміналі і ўдакладнялі асобныя падзеі. Успаміналі і пераезд у гэты будынак. Падымаючыся па сходах да дзверы паверх і адчыніўшы налева дзверы, І. Сіманоўскі сказаў, што тут будзе размяшчацца Беларускі аддзел і каб я ўзялася гаспадарыць у ім.

Да гэтага ў „сферах" абмяркоўвалася пытанне пра арганізацыю 2-х асобных бібліятэк: універсітэцкай і краязнаўчай беларускай. Перамагла думка І. Сіманоўскага, які лічыў немэтазгодным распыляць сродкі на арганізацыю розных бібліятэк, а трэба адну з добра арганізаваным краязнаўчым аддзелам. У гэтым пакоі і павінна была пачаць існаванне краязнаўчая бібліятэка і нават ~~дла~~ на паліцах ужо ляжалі кіпкамі невялічкія кніжкі. Працавала Марыя Васільеўна Баранкава.

Дырэктар загадаў усім працаўнікам бібліятэкі, каб пры разборы фондаў яны вы-

адзялялі масавыя выданні і тыя, што мелі адносіны да Беларусі, і накіроўвалі ў Беларускі аддзел.

Так пачаў існаваць краязнаўчы аддзел да таго як атрымаў „папяровае" благаслаўленне.

У зале аддзела змяшчалася таксама чытальня для навуковых працаўнікоў. На сталах былі раскладзены новыя атрыманні навуковай літаратуры — савецкай і замежнай, кнігі і часопісы.

Аддзел працаваў з 10 да 22 г., апроч 2-х дзён. Працаўнікоў двое: я і М. В. Барашкава, потым яе замяніла С. Ф. Сярчэева, а далей Мількевіч.

Пасля пераходу ў новы будынак у 1932 годзе працавалі: М. А. Васілеўская, Гольдберг, адна працаўніца на падборцы газет (між іншым, у аддзеле рабіліся выразкі з газет па розных тэмах).

У суседнім вялікім пакоі новага будынка, дзе цяпер даведачна-бібліяграфічны аддзел, размясцілі абавязковы экземпляр

Кніжнай палаты і даручымі напамагу нагляду-наогул у аддзеле працавацца шчыльны кантакт з Кніжнай палатай ях і дзягтуня.

[Успамінаецца выпадак. Дзеля таго, каб упарадкаваць архіў Кніжнай палаты, далі нам хлопца, які і заняўся даручанай справай. Хлопец спакойны працаваў, зацікаўлены кнігамі. Аднойчы мне спатрэбілася энцыклапедыя Брокгаўза і Ефрона, што стаяла ў нашай зале. Я не знайшла патрэбнага тома і стала пераглядаць усе па парадку. Мне зрабілася горача, бо не хапала некалькіх тамоў. Хлопец прыходзіў з невялікай фанернай скрынкай. Сталі за ім сачыць і пры выхадзе затрымалі — выносіў некалькі кніг. У яго знайшлі не толькі тамы энцыклапедыі (пад ложкам), але і кнігі з архіва Кніжнай палаты.]

Умовы працы і побыту былі нялёгкія: і халаднавата, і галаднавата, і адзенне не вельмі грэе. Часцей яно было самаробнае, па-майстэрску злепленае і зацыраванае. Я фарсіла ў чаравіках, самастойна змайстраваных, на вяроўчаных або ад старога абутку падмётках.

Вялікай падзеяй было наладжванне цэнтральнага ацяплення. Ад радыятараў павеяла цяплом! Праўда яно яшчэ не магло як след абагрэць вялікую залу, але прымасціўшыся каля радыятара ў малым пакойку, можна было пісаць, скінуўшы з правай рукі паліто, і трохі абагрэць ногі.

Камплектаванне.

Ў аддзеле пачалі збірацца выданні на беларускай мове — кнігі, часопісы, газеты, а таксама матэрыялы, што дадычылі так званага Паўночна-Заходняга краю з губернямі, якія ўваходзілі ў яго склад, незалежна ад мовы, часу і месца выдання. Збіраліся і мясцовыя друкі — кнігі, часопісы, лісткі. Іх знаходзілі ў фондах бібліятэкі, у новых атрыманнях (з 1922 года бібліятэка стала атрымліваць абавязковы экземпляр). Нямала рэдкіх беларускіх выданняў прыносілі розныя прыхільнікі бібліятэкі — іх было нямала. Часам вандроўкі ў гарады Беларусі (Мсціслаў, Клімавічы, Полацк) давалі нямала прыемных неспадзяванак. У гэтых гарадах былі знаёмыя з былых студэнтаў, і яны нямала дапамагалі. Былі набыты бібліятэкі Карскага, Янчука, Жуковіча, зборы кніг Я. Купалы, Я. Дылы і інш. Успамінаецца мне восень 1921 года, калі мне даручана было разабраць бібліятэку Духоўнай

семінарыі. Яна змяшчалася на Траецкай гары, дзе цяпер Суворацкая вучэльня (вуліца М. Горкага). Будынак займала нейкая вайскова-вая ўстанова, пры ўваходзе стаяў вартавы. У вялікім памяшканні на падлозе ляжалі звязаныя пачкі кніг, знятыя з паліц, а шафы, відаць, атрымалі новае прызначэнне. Тут былі камплетныя камплекты рускіх перыёдыкі, процьма кніг па гісторыі, старадрукаў — славянскіх і замежных, былі і краязнаўчыя выданні. Мне трэба было выбраць патрэбныя для бібліятэкі матэрыялы, а астатняе пакінуць. У рабоце мне дапамагалі мышы, якія не лічыліся з маёй прысутнасцю, а ўвесь час з піскам шмыгалі з канца ў канец.

У дублетных фондах Масквы і Ленінграда працаваў супрацоўнік бібліятэкі Пінскі, якому даручана было адбіраць кнігі для бібліятэкі; асаблівую ўвагу рэкамендавалася ўдзяляць матэрыялам, якія маг-

ліб напоўніць зборы беларускага аддзела.

Шмат увагі аддаваў камплектаванню аддзела У. Сіманоўскі. Ён быў трапным паляўнічым па цікавыя і каштоўныя кнігі. Часта пачынаў ён свой неафіцыйны працоўны дзень корпаннем у пыльных напластаваннях у падвальных сховах. І вось запылены, але з трыумфам, сігаючы праз некалькі прыступак на сходах, нясе ён у аддзел якую-небудзь знаходку і ззяе ад задавальнення. Пасля яго наведвання Віцебска і знаёмства з А. П. Сапуновым аддзел атрымаў „Статут Вялікага княства Літоўскага" 1588 года, „Апокрисис Христофора Филалета" 1599 г. на старабеларускай мове, а таксама кнігі самога А. П. Сапунова — „Витебская старина" і інш.

Сярод старажытных кніг захоўваецца ў нас рукапіс у акладзе з драўляных дошчачак, абцягнутых скурай. Праф. В. Н. Перетц апісаў нашы зборы ў кнізе: „Рукописи

Кнігі ў б-цы няма, а трэба
было б яе паглядзець

Московского университета, Самарских биб-
лиотек и музея и Минских собраний" (Л., 1934)
[быў ён у нас у канцы 20-х гадоў ішчэ ў старым будынку]
Мы ганарыліся таксама тым, што мелі
кнігі „Біблії" Ф. Скарыны (6-7?), але адкуль
яны трапілі не памятаю. Захоўваліся ў нас
„Мужыцкай праўды", „Pismo Jaśka Haspa-
dara z pad Wilni"... і інш. Трымалі мы
і „Sonety krymskie" А. Міцкевіча з яго
аўтографам. У аддзеле меліся першыя вы-
данні Дуніна-Марцінкевіча, Багушэвіча, Ал.
Цёткі (і яе пракламацыі-вершы), Купалы, Ко-
ласа, Багдановіча, Бядулі, Гартнага і інш. Доб-
ры падбор быў выданняў т-ва „Загляне сон-
ца і ў наша аконца".

У мяне асабіста было шмат беларускіх вы-
данняў. З іх не раз даводзілася мне папоў-
няць тое, чаго няма ў аддзеле. На-жаль з
гэтага збору нічога не засталося. Энтузія-
сты-добраахвотнікі дапамагалі ў камплек-
таванні аддзела не толькі сваімі дарамі,

але і каштоўнымі падказкамі, дзе кнігі шукаць без дбайнага гаспадара. Нельга не ўспомніць добрым словам Язэпа Лявонавіча Дылы, зацікаўленага прыхільніка бібліятэкі і частага наведвальніка. Шмат яго кніг з ініцыяламі „Я.Д." стаяла на нашых паліцах.

Як прамінуць імя нашага славутага баяна, незабыўнага Янку Купалу. Ён быў жаданым госцем, з адвагаю дзяліўся сваімі ведамі пра кнігі па вывучэнню Беларусі, пра аўтараў беларускіх выданняў. Вось у яго руках „Наша ніва" часоў вайны. Там гэтулькі белых плям, непадпісаных артыкулаў, псеўданімаў. Гартаючы, паказвае: „гэта маё і гэта маё" (у той час ён быў рэдактарам газеты).

Купала прынёс у бібліятэку у 20-ыя гады на захаванне дзве пачкі сваіх рукапісаў. Перадаючы мне ў рукі ён казаў:

„Гэта мае рукапісы. У вас яны лепей захаваюцца"! Тут і „Жалейка" і „Шляхам жыцця" і „Слова аб палку Ігаравым" і шмат асобных лісткоў, перапісаных рукою паэта. Рукапісамі Купалы ў 30-ыя гады карыстаўся супрацоўнік АН БССР М.Ф. Мачульскі.

Следам за Купалам і іншыя пісьменнікі сталі прыносіць свае працы. Прынёс М. Грамыка сшытак сваёй паэмы „Крылан", Ц. Гартны „Сокі цаліны" і яшчэ некаторыя творы, назвы якіх я не памятаю, Я. Лёсік перадаў сваю „Граматыку беларускай мовы" і рукапісы К. Каганца і нямала яго лістоў. Прозвішч іншых не памятаю. Зарэгістраваны былі атрыманні ў агульным спарку. Калі я ў 1937 годзе выязджала, перадала фасцыкулы рукапісаў (Ц. Гартнага, М. Грамыкі, Я. Лёсіка і інш.) нам. дырэктара ... Шкільбэргу.

Успамінаецца яшчэ адзін зацікаўлены прыхільнік бібліятэкі, які аддаваў ёй

шмат увагі і дапамагаў, чым мог.
Пра гэта не раз давялося чуць ад І. Б. Сімаўскага. Гутарка ідзе пра У. І. Пічэту. Ён часта наведваў беларускі аддзел. Ветлівы, далікатны, без зазнайства, умеў пажартаваць. Заўсёды некуды спяшаўся, толькі развяваўся чуб.

Г Нябавам жыццё (ужо ў 1923 годзе)
прымусіла заняцца гэтым

Каталогі, картатэкі, бібліяграфічная праца.

Адначасна з упарадкаваннем фондаў аддзела пачалі складаць каталогі – алфавітны, сістэматычны. Паступова каталогі ўскладняліся. З 1926 года, калі пачаў выдавацца „Летапіс беларускага друку", мы без затраты часу на дубліраванне маглі ўключаць у алфавітны каталог дадатковыя карткі на прозвішчы рэдактараў, перакладчыкаў, мастакоў, на выдавецтвы, серыі, калектыўных аўтараў, нават на назвы кніг. У 30-ыя гады быў створаны каталог кніг пра асобныя геаграфічныя мясцовасці Беларусі, а таксама пачата праца па складанню прадметнага каталога, які патрабуе шмат клопату.

Каталогі памагалі даць адказ чытачам, што маецца ў аддзеле, але шмат было і прыхавана ў фондах бібліятэк матэрыялаў, якія маглі дапамагчы ў вывучэнні Беларусі – напр., артыкулы ў перыёдыцы. Трэба было ўзяцца за выяўленне іх. Таксама патрабавальныя чытачы: праваднікі універсітэта і

іншых культурных устаноў, настаўнікі, студэнты чакалі такой дапамогі. Пытаннямі краязнаўства займаліся многія. Магчымасцяў у нас было малавата, трэба было шукаць выхаду. Выяўленнем літаратуры пра вытворчыя сілы краіны зацікавілася такая паважаная ўстанова як Дзяржплан; удалося ад яе атрымаць сродкі, на якія можна было ў пазаштатным парадку арганізаваць перагляд розных бібліяграфічных крыніц. Звесткі пра Беларусь былі раскіданы па розных бібліяграфічных крыніцах на рускай, польскай і іншых мовах. Працы бібліёграфаў: Мязова, Ламбіных, Фінкеля, Эстрайхера і шмат якіх іншых захоўвалі многа патрэбных нам вестак. Некія сродкі былі атрыманы і ад Інбелкульта. Пачалася праца ~~па~~ перагляду крыніц і пісанню картак для краязнаўчай картатэкі. Пісалі студэнты Універсітэта (І. Бараноўскі, Адзярыха

і іншых), пісалі бібліятэкары. Успамінаю аднаго пачатуніка[2] пайсылага, які добра ведаў лацінскую мову. У старых картатэках і дагэтуль захавалася многа яго запісаў з ініцыяламі „Т.М.“. Перапісчыкамі былі сотні дапаможнікаў, спісаў, якія рэгістраваліся ў асобным спіску. Паступова з часам утварылася картатэка па розных галінах ведаў, якая ў 1937 годзе – паводле падлікаў І. Сімановскага – налічвала 300 тысяч запісаў. Карысталіся асобнымі раздзеламі картатэкі, пры спрыяльных умовах, можна было выдаць шмат карысных даведнікаў.

Сумесна з Інстытутам беларускай культуры быў распрацаваны план серыі пад назвай: „Матэрыялы да беларускай бібліяграфіі“. У задачу Інбелкульта ўваходзіла навуковая рэдакцыя бібліяграфічных прац. Вось як выглядаў гэты перспектыўны план „Матэрыялаў“:

Том 1. Прырода і вытворчыя сілы Беларусі.
" 2. Народная гаспадарка
" 3. Палітычнае і грамадскае жыццё.
" 4. Этнаграфія.
" 5. Мова і літаратура.
" 6. Мастацтва.
" 7. Гісторыя. Археалогія.

Праца А. Шлюбскага „Этнаграфія" выйшла як том 4 „Матэрыялаў". Аўтар перадаў сваю працу ў гатовым выглядзе. Справу з друкарняй, якая змяшчалася ў Доме прафсаюзаў на плошчы Свабоды, меў я, а таксама правіла карэктуру.

Хочацца добрым словам успомніць археолага С.А. Дубінскага, які распачаў працу па бібліяграфіі археалогіі. Яму я перадаў картатэку з запісамі друкаваных матэрыялаў па археалогіі. Гэта быў сырны матэрыял, які патрабаваў апрацоўкі de visu, удакладненняў, дапаўненняў. Сівавата, руплівы С.А. Дубінскі ў бібліятэцы быў

сваім чалавекам, добра арыентаваўся ў каталогах, самастойна адшукваў патрэбныя кнігі. Працаваў ён многа і шчыра, з паляўнічым азартам. Дзень у дзень можна было яго бачыць у бібліятэцы, дзе ён удакладняў свае запісы, знаходзіў новыя матэрыялы. Калі С. А. Дубінскі праглядаў бібліяграфічныя даведнікі для сваёй мэты, ніколі не мінаў непатрэбных для яго працы, але для нашых картатэк не лішніх. Цяпер, праглядаючы даўнія картачкі, я знаходзіла пісаныя яго рукою карткі з ініцыяламі С. Д. У яго было каштоўнае спалучэнне ведаў спецыяліста з „пісьменнасцю“ бібліёграфа, чым не ўсе спецыялісты могуць пахваліцца. У артыкуле В. Тарасенкі пра С. А. Дубінскага (Полымя, 1968, № 2) адзначана, што ён „шырока выкарыстаў картатэку Спіцына, вучнем якога ён з'яўляецца. Мне цяжка судзіць як там было, але што ён апрацоўваў раздзел нашай картатэкі, у

якую, магчыма, [illegible] і матэрыялы, змешчаныя ў Спіцына (мы не к таму часу прагледзелі вельмі многа крыніц), я не пацвярджала. Бібліяграфія была выдана АН БССР у 1933 годзе.

З іншых апрацаваных раздзелаў картатэкі ўпамяну ненадрукаваную бібліяграфію „Прырода і вытворчыя сілы Беларусі“.

Многа ўвагі я ўдзяляла бібліяграфіі беларускай літаратуры, давялося прагля-дзець многа крыніц, газет. Асабліва багатай была персанальная картатэка Я. Купалы, Я. Коласа, Ц. Гартнага, З. Бядулі, Цёткі. Дапамагалі і самі пісьменнікі (Я. Купала, Ц. Гартны) ў выяўленні сваіх псеўданімаў, прагледзеў картатэку і Бядуля. У зборніку „Ц. Гартны ў літаратурнай крытыцы. Да 20-годдзя яго літаратурнай дзейнасці“ (Мінск, 1928) быў змешчаны бібліяграфічны нарыс „Літаратурныя працы Цішкі Гартнага“. Пісьменнік быў вельмі задаволены, і я нават атрымала ад яго „Сокі цаліны“ з надпісам: „Укладальніцы

маёй бібліяграфіі". Займалася я таксама бібліяграфіяй гісторыі беларускага тэатра. Цікавілі мяне паведамленні ў газетах („Наша ніва") пра беларускія вечарынкі, якія наладжвалі гурткі ў розных мясцовасцях (у Вільні, Пецярбургу і г.д.), а ў савецкі час у самадзейных гуртках не абыходзілася без „Збянтэжанага Саўкі" або „Як яны жаніліся". А Буйніцкі! А вандроўнік Галубок з яго трупай! Чаго варты! Утварылася цікавая картатэка пра першыя крокі і станаўленне тэатральнай справы на Беларусі і пра тэатры 1, 2 і 3. Картатэка ў бібліятэцы захавалася.

да стар. 26-27.

У канцы 50-х гадоў па просьбе Ў. Сіманоўскага я паслала з Саратава яму свае нататкі-успаміны пра першыя крокі бібліяграфічнай работы. У яго кнізе „Белорусская советская библиография" (Минск, 1965) я знайшла іх сляды. На стар. 24 мяне здзівіла сцвярджэнне, што даведачна-бібліяграфічная работа вялася аб'яднанымі сіламі бюро і беларускага аддзела, і нават пералічаны некаторыя тэмы, якія былі выкананы на заданне розных устаноў і арганізацый. Нешта

ў маёй памяці сцёрліся гэтыя асобы з „бюро", хоця яно сапраўды на паперы існавала. Ці не праца гэта аднаго Беларускага аддзела? А можа аўтар памыляецца, што тады я ў 2-х асобах — бюро і беларускі аддзел? Увогуле „бюро" не адчувалася. У сваіх нататках я не ўпамінаю пра публікацыю краязнаўчай бібліяграфіі ў час. „Наш край", „Савецкая краіна". У апошнім раздзеле кнігі, што ўпамінаецца вышэй, падаюцца назвы надрукаванага ў часопісах. Варта іх трохі ўдакладніць.

Успамінаю, як адбывалася гэта падзея. У пачатку 1926 года завітаў у Беларускі аддзел супрацоўнік Цэнтральнага Бюро краязнаўства М. І. Каспяровіч, чалавек энергічны, ініцыятыўны. Мы пачалі гутарку пра тое, як аддзел можа дапамагчы часопісу „Наш край". Вырашылі, што найлепшая дапамога краязнаўчым таварыствам і асобным краязнаўцам — гэта бібліяграфія. У нашай даволі значнай ужо ў той час картатэцы можна было выбраць сёе-тое і, дапаўнішы, даваць стала

у часопіс. Праз нейкі час я падрыхтавала карткі і перадала ў рукі М. Каспяровічу (таям друкарні не адмаўляліся і ад картак). Першая публікацыя з'явілася ў № 2-3 часопіса „Наш край" за 1926 год пад назвай „Геаграфія Беларусі. Падарожнікі" з прыпіскай, зробленай М. Каспяровічам: „З картатэкі бібліягр. камісіі Інбелкульта". Трэба засведчыць, што існавала толькі адна картатэка, а асобнай картатэкі Бібліяграфічнай камісіі Інбелкульта не было. У № 10 часопіса за 1929 год выпраўлена недакладнасць і было надрукавана: „З картатэкі Бел. дзярж. бібліятэкі." Бібліяграфія друкавалася без подпісу.

[ гл. „Наш край", 1926, №№ 2-3, 10-11;
1929 №№ 5-12; 1930 №№ 1-10; „Сав. краіна";
1932 №№ 7-10, 12; 1933 № 1]

Успамінаецца мне вялікая комплексная бібліяграфія, разлічаная на 30 друкаваных аркушаў, складзеная на аснове матэрыялаў картатэкі — „Бібліяграфія беларусазнаўства". Уваходзілі запісы літаратуры за 1917-1927 гг., дапушчана была і

літаратура на замежных мовах. Да паловы 1930 года было надрукавана аркушаў 12-15 (дакладна не памятаю, але перад вачыма ўстае цэлы стос надрукаванага на маім стале). Некалькі экземпляраў друкавалася на адным баку. Без затрымкі яны перадаваліся ў пераплётную майстэрню для наклейкі на карткі. ~~У картатэцы і цяпер~~ Наскаралася друкаванне тым, што друкарні прымалі ў набор карткі без машынапісных копій. У картатэцы і цяпер з-спатыкаю карткі са штампам Галоўліта – нікто з працаўнікоў не мог дагадацца, што гэта азначае. Не па віне бібліятэкі друкаванне было спынена, надрукаванае не захавалася, засталіся толькі наклееныя карткі. Меркавалася зрабіць з картак аператыўную картатэку надрукаванага.

Успамінаю, што М. Каспяровіч, назнаёміўшыся з бібліяграфіяй, запрапанаваў пачаць работу па дапаўненню бібліяграфіі „Этнаграфія" А. Шлюбскага. З пачатку аддзел этнаграфіі ўжо быў надрукаваны.

У дырэктара бібліятэкі былі і намеснікі. У 20-ыя гады звычайна яны мясціліся ў невялічкім пакойку Беларускага аддзела што побач з кабінетам дырэктара. Сярод іх знаходзіўся адзін, які цікавіўся бібліяграфічнай працай — гэта быў У. Пракулевіч. Памятаю яго „Скарыніяну" што заўсёды ляжала ў яго на стале. Відаць збіраў запісы ён здаўна і па магчымасці дапаўняў іх. У часопісу „Савецкае будаўніцтва" перыядычна пачаў змяшчаць бібліяграфію на тэмы, якія цікавілі чытачоў часопіса. Прымаў дзейны ўдзел у падрыхтоўцы да друку „Бібліяграфіі беларусазнаўства", якая была спынена ў палове 1930 года.

—

Трохі пра ўдзел Бібліятэкі ў працы па выданню агульнасаюзнай бібліяграфіі „Научная литература СССР" (выдавалася з 1928 года, спынілася ў 1934 годзе). У складанні рэфератаў літаратуры БССР прымалі ўдзел навуковыя працаўнікі розных спецыяльнасцяў. Дублетныя запісы Бібліятэка пакідала сабе, мяркуючы выдаць з часам перыодык „Навуковая літаратура БССР". Аднак, упэўніўшыся, што ў шырокім маштабе падняць працу немагчыма, намерыліся выкарыстаць матэрыялы для выдання анатаванай бібліяграфіі „Флора і расліннасць БССР", дапоўніўшы пазнейшымі выданнямі (індэксы навуковай літаратуры спыніліся ў 1934 г.).

Сляды гэтай цікавай працы (асобныя пачкі лісткоў з запісамі) я знаходзіла цяпер у сховах беларускага аддзела. У 1937 годзе працу праглядалі многія спецыялісты. Памятаю як уважліва наставіўся да яе праф. ... Кайгародаў, аўтар кліматычнага атласа БССР.

---

На заданню Інстытута гісторыі КПБ былі складзены і надрукаваны на ратапрынце спісы літаратуры: „Матэрыялы да гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны на Беларусі". Мне трапіліся цяпер спісы №№ 6 і 7, надрукаваныя на камяровай грубай паперы. Спіс № 7 (літаратура да 1932 г. укл.) мае 656 запісаў, ёсць забароненая літаратура. Для Гістпарта рабіліся таксама на асобных лістках запісы з анатацыямі.

---

Успамінаецца карпатлівая работа, праведзеная на просьбе Гідралагічнага інстытута (Ленінград). Яны прыслалі некалькі сот картак (700?) запісаў літаратуры па гідралогіі з просьбай праверыць па нашых картатэках і дапоўніць. Праграма іх была шырокага афоту. Дадаткаў набралася вельмі шмат.

(30-ыя гады, з новых бібліятэкаў)

---

На заданню Белдзяржкіно складзена картатэка рэцэнзій на іх фільмы.

Іншы характар мела праца па рэтраспектыўнаму ўліку друкаў БССР і друкаў на беларускай мове з XIX ст. да 1917 г. Уласна кажучы, гэтым павінна была займацца Кніжная палата, але магчымасцей у яе не было. Адзінаму працаўніку хапала бегаць па друкарнях, выдавецтву, „лавіць" і выяўляць недасланыя выданні, выдаваць „Летапіс", займацца статыстыкай друку. Друкарні яшчэ не прывыклі да абавязку здаваць належную колькасць экземпляраў у Кніжную палату. Працаўнік М. М. Улашчык шмат маладой энергіі і запалу ўкладаў у сваю працу, праводзіў яе ў кантакце з Беларускім аддзелам. Орган рэгістрацыйнай бібліяграфіі „Летапіс беларускага друку БССР" выйшаў у пачатку 1926 года (№№ 1-6 за 1925 год). Але яшчэ да ўтварэння асобнага органа друку была спроба падаваць весткі пра новыя выданні ў часопісе „Асвета" (1924, № 2 ліпень-жнівень) пад назвай „Летапіс беларускага друку" (за студзень-чэрвень). І трэба адзначыць, што матэрыялы апрацаваны Кніжнай палатай пры Дзярж. бібліятэцы, на самай справе праца была зроблена ў Беларускім аддзеле, індэксы ставіла О. А. Малініна. Не памятаю,

ці працавец учэ М. М. Плешчанк.

На чарзе было заданне па выяўленню мясцовых выданняў з 1917 па 1924 г., да пачатку іх рэгістрацыі ў „Летапісу". У 1927 і 1929 гг. былі выданы ў серыі „Летапіс беларускага друку" рэтраспектыўныя бібліяграфіі асобных выданняў і перыёдыкі на беларускай мове, а таксама ўлічаны друкі на беларускай мове за XIX ст. да 1917 года.

Каб ўлічыць дарэвалюцыйныя друкі на беларускай мове, трэба было выкарыстаць крыніцы, дзе маглі б яны быць апісаны. Перш за ўсе, гэта „Белорусы" Е. Карскага (т. III, 3), „Гісторыя беларускай літаратуры" М. Гарэцкага і інш. Вельмі ўважліва праглядаліся газеты, асабліва „Наша ніва", літаратуразнаўчыя артыкулы. Рэгістраваліся беларускія выданні і ў „Книжной летописи". Тут можна было знайсці весткі і пра тыраж, а ён рэдка калі прастаўляўся на кнігах. Выкарыстоўвалася і „Статистика произведений печати" за асобныя гады. Трэба мець на ўвазе, што ў „Книжную летопись" трапілі не ўсе бела-

рускія друкі — яны выдаваліся не толькі ў Расіі і не ўсе з блаславеннем цэнзуры. У 1928 годзе ў часе свайго адпачынку я наведала Ленінград, дзе ўдалося праверыць сабраны матэрыял па фондах бібліятэкі імя Салтыкова-Шчадрына, якая захавала шмат беларускіх друкаў (былі пад бокам „Главного управления по делам печати"). На жаль, нельга было границу так лёгка за межы Беларусі — у Вільню, а там шмат чаго можна было знайсці. Для праверкі de visu і выяўлення новых матэрыялаў былі выкарыстаны і прыватныя зборы. Успамінаецца Б. Эпімах-Шыпіла, які ў той час жыў у Мінску. У яго я знайшла цікавыя выданні. Мяне вельмі ўзрадавалі пашпартныя Цёткі, якая пісала Б. Эпімах-Шыпілу пра свае падарожжа ў Фінляндыю. Гэты матэрыял я выкарыстала ў сваім нарысе пра Цётку („Зап. адд. гуманіт. навук Інбелкульта, кн. 1, 1928)

Не магу ўспомніць, чаму ў бібліягра-

фію не трапілі фальклорных збор- 
нікі, нейкія размовы былі. Безумоўна, шкада.

Радуе аднак тое, што і ў такім выглядзе ўдалося выдаць у 1929 г., бо ў наступным вялікапамятным годзе гэта было б немагчыма. Успомніць трэба знятую з друку „Бібліяграфію беларусазнаўства", і нават падрыхтаваных аркушаў не засталося. Удача „праскочыла" і бібліяграфія „Беларускі перыядычны друк". Артыкулы ~~са~~ за з часопісаў і зборнікаў за 1917–1927 гг. (выд. у 1929 г.)

Працяг гэтай працы, вялікая картатэка запісаў за 1928–1937 (мінскіх), пасля вайны ў Бібліятэцы не была знойдзена. [Давялося ствараць занава; апрацаваны артыкулы за 1928–1932 гг. (з 1933 г. друкаваў іх „Летапіс") На жаль, у картатэку не трапіла шмат прозвішчаў і таму камплектнасць не абмежавана.] У такім выглядзе ў 30-ыя гады нельга было падрыхтаваныя матэрыялы выдаць. Той, хто перажыў тую злавесную эпоху, можа зразумець усе падводныя

рады і дыпламатычныя меркаванні. Шмат было прозвішчаў, якія ў той час стараліся не ўспамінаць і чытачам не паказваць.

Адначасна праводзілася праца па выяўленню друкаў на рускай мове за 1917-1924 гг. На польскай і яўрэйскай мовах улічвалі польскі і яўрэйскі аддзелы бібліятэкі. Апісваліся тыя выданні, якія траплялі з розных крыніц у фонды бібліятэкі – мясцовых і дублетных фондаў Масквы і Ленінграда, праглядалася „Кніжная летапіс". Але ў тыя бурныя гады пасля кастрычніка шмат чаго з друкаў не трапіла ў „Кніжную Летапіс" – друкарні не вельмі спяшаліся з адсылкай у Кніжную палату абавязковых экземпляраў. Грамадзянская вайна, транспартныя непаладкі таксама не садзейнічалі своечасовай дасылцы. Для таго, каб мець больш дакладнае ўяўленне аб кніжнай прадукцыі таго часу, давялося шукаць сляды ў выдавецкіх планах і справаздачах савецкіх органаў

дзе даваліся весткі і пра выдавецкую дзейнасць; у перыядычным друку, абвестках на вокладках кніг („выйшлі з друку“) і г.д. У гэтых крыніцах не заўсёды давалася дакладнае апісаньне, не было і іншых элементаў у апісаньнях. З гэтай часткі шмат чаго ўдалося прагледзець de visu, аднак некаторыя запісы засталіся з няпоўнымі весткамі і іх не ўдалося адшукаць. У картатэцы налічвалася да 1000 назваў за 1917–1924 гг., у параўнаньні з „Книжной летописью“ было шмат дадаткаў.

У пачатку 30-х гадоў я наведаў Кніжную палату ў Маскве для таго, каб удакладніць некаторыя весткі пра друкі на рускай мове за 1917–1924 і прагледзець №№ „Книжной летописи“, якіх у нас не было. Маючы перадрукаваную на машынцы бібліяграфію, звярнуўся за дазволам да дырэктара Кніжнай палаты (Салаўёва?). Пагутарыўшы са мною і прагледзеўшы рукапіс, дырэктар прапанаваў выдаць працу, але наша бібліятэка не згадзілася. А шкада...

Лічылася, што картатэка загінула, але месца яе захавання ~~было~~ аказалася такім надзейным, што праз гады папяровая скрынка з карткамі і надпісамі, зробленымі маёй рукой, была непашкоджанай і Кніжная палата вырашыла бібліяграфію выдаць (выд. у 1969 г.) на ратапрынце. Карпатлівую работу па праверцы матэрыялаў прарабіла ф. Мерына, дзяку-чытушчы друкі на польскай і рускай мовах. Шкадую, што перад друкаваннем мне не паказалі апошні адбітак, і я post factum выявіла непрыемныя недарэчнасці, напр. н 245 не на польскай мове, а на беларускай лацінскімі літарамі. На стар. 73-83 пададзены спіс друкаў, якіх пры праверцы не адшукалі, а іх далі ~~дзеля~~ як неапісаныя de visu, хаця большасць у свой час апісвалася з выданняў, якія былі ў руках, толькі Тыразка на кнігах не было (ён у той час рэдка праставіўся). Са 115 нн спіса толькі 23 можна лічыць падзеямі з няпоўнымі весткамі.

# Трохі пра карысць самаадукацыі.

У 20-ыя гады не толькі моладзі, але і людзям болей сталага веку даводзілася брацца за працу, пра якую мелі вельмі няяснае ўяўленне. Трэба! А калі трэба, то і вучыцца трэба!

Бібліятэчная справа... Хто з працаўнікоў канчаў нейкія спецыяльныя ўстановы? Без самаадукацыі не абыдзешся.

Я трапіла на працу не са школьнай лаўкі: дзве зімы вышэйшых (Бестужаўскіх) курсаў, пяць гадоў настаўніцкай працы.

Мне трэба было вучыцца на хаду: авалодець тэхнікай бібліятэчнай працы і паглыбіцца ў нетры краязнаўства.

Памагалі мне кнігі і спрактыкаванае кіраўніцтва Э. Сіманоўскага, які не шкадаваў намаганняў і часу, каб з мяне атрымаўся сякі-такі неблагі працаўнік.

Вялікая ўдзячнасць у мяне захавалася да шчырых нашых прыхільнікаў і энтузіястаў беларускай культуры, якія дапамагалі арыентавацца ў моры краязнаўчай літаратуры (напр. Я. Купала, Я. Дыла і шмат хто іншы)

Дапамагалі і чытачы, калі яны звярта-ліся за дапамогай падабраць літаратуру па пэўнай тэме. Успамінаецца Е. Міровіч, калі ён ставіў п'есу „К. Каліноўскі". Мне давяло-ся прачытаць нямала матэрыялаў. Гэта бы-ла цікавая ўзаемадапамога.

Мне прыемна было чытаць, як мяне кваліфікаваў У. Сіманоўскі ў сваёй кнізе „Белорусская совет. библиография" (Мн., 1965). Значыцца, не дарма траціў час на маю бібліяграфічную адукацыю.

стар. 43 „Выросли на работе и кадры ква-лифицированных ведущих библиографов. Среди них Ю.О. Бибило, организатор и руково-дитель Отдела белорусской литературы и биб-лиографии =

стар. 16 ... „старейший библиограф БССР, по существу зачинатель белорусской со-ветской библиографии" Ю.О. Бибило."

Нізкі паклон, мае паважаныя настаўнікі!

[illegible] D

## МЕТРИЧЕСКАЯ СИСТЕМА МЕР

### МЕРЫ ДЛИНЫ ИЛИ ЛИНЕЙНЫЕ

1 километр *(км)*=1000 метров *(м)*
1 метр *(м)*=10 *дм*=100 сантиметрам *(см)*
1 дециметр *(дм)*=10 сантиметрам *(см)*
1 сантиметр *(см)*=10 миллиметрам *(мм)*

### МЕРЫ ПЛОЩАДИ

1 кв. километр *(кв. км)*=1000000 квадратных метров *(кв. м)*
1 кв. метр *(кв. м)*=100 квадратным дециметрам=10000 кв. сантиметров *(кв. см)*
1 гектар *(га)*=100 арам *(а)*=10000 кв. метров *(кв. м)*
1 ар *(а)*=100 кв. метрам *(кв. м)*

### МЕРЫ ВЕСА

1 тонна *(т)*=1000 килограммов *(кг)*
1 центнер *(ц)*=100 килограммам *(кг)*
1 килограмм *(кг)*=1000 граммов *(г)*
1 грамм *(г)*=1000 миллиграммов *(мг)*

### МЕРЫ ОБЪЕМА

1 куб. метр *(куб. м)*=1000 куб. дециметров=1000000 куб. сантиметров *(куб. см)*
1 куб. дециметр *(куб. дм)*=1000 куб. сантиметров *(куб. см)*
1 литр *(л)*=1 куб. дециметру *(куб. дм)*
1 гектолитр *(гл)*=100 литрам *(л)*

## ТАБЛИЦА УМНОЖЕНИЯ

| | | | |
|---|---|---|---|
| 2 × 1 = 2 | 3 × 1 = 3 | 4 × 1 = 4 | 5 × 1 = 5 |
| 2 × 2 = 4 | 3 × 2 = 6 | 4 × 2 = 8 | 5 × 2 = 10 |
| 2 × 3 = 6 | 3 × 3 = 9 | 4 × 3 = 12 | 5 × 3 = 15 |
| 2 × 4 = 8 | 3 × 4 = 12 | 4 × 4 = 16 | 5 × 4 = 20 |
| 2 × 5 = 10 | 3 × 5 = 15 | 4 × 5 = 20 | 5 × 5 = 25 |
| 2 × 6 = 12 | 3 × 6 = 18 | 4 × 6 = 24 | 5 × 6 = 30 |
| 2 × 7 = 14 | 3 × 7 = 21 | 4 × 7 = 28 | 5 × 7 = 35 |
| 2 × 8 = 16 | 3 × 8 = 24 | 4 × 8 = 32 | 5 × 8 = 40 |
| 2 × 9 = 18 | 3 × 9 = 27 | 4 × 9 = 36 | 5 × 9 = 45 |
| 2 × 10 = 20 | 3 × 10 = 30 | 4 × 10 = 40 | 5 × 10 = 50 |
| 6 × 1 = 6 | 7 × 1 = 7 | 8 × 1 = 8 | 9 × 1 = 9 |
| 6 × 2 = 12 | 7 × 2 = 14 | 8 × 2 = 16 | 9 × 2 = 18 |
| 6 × 3 = 18 | 7 × 3 = 21 | 8 × 3 = 24 | 9 × 3 = 27 |
| 6 × 4 = 24 | 7 × 4 = 28 | 8 × 4 = 32 | 9 × 4 = 36 |
| 6 × 5 = 30 | 7 × 5 = 35 | 8 × 5 = 40 | 9 × 5 = 45 |
| 6 × 6 = 36 | 7 × 6 = 42 | 8 × 6 = 48 | 9 × 6 = 54 |
| 6 × 7 = 42 | 7 × 7 = 49 | 8 × 7 = 56 | 9 × 7 = 63 |
| 6 × 8 = 48 | 7 × 8 = 56 | 8 × 8 = 64 | 9 × 8 = 72 |
| 6 × 9 = 54 | 7 × 9 = 63 | 8 × 9 = 72 | 9 × 9 = 81 |
| 6 × 10 = 60 | 7 × 10 = 70 | 8 × 10 = 80 | 9 × 10 = 90 |

Целлюлозно-бумажный комбинат „Герой труда“ г. Добруш, БССР.
Артикул 1080-БЛ ГОСТ 12063-66 Сорт I 1971 г. I квартал. 12 листов. Цена 2 коп.